## Женщины Лабиринта

Город = дом многоколонный,
Залы, храмы, лестниц винт,
Двор, дворцами огражденный,
Сеть проходов, переходов,
Галерей, балконов, сводов, –
Мир в строеньи: Лабиринт!..

Пусть преданья промолчали;
Камень, глина и металл,
Фрески, статуи, эмали,
Встали, как живые были, –
Гроб раскрылся, – и в могиле
Мы нашли свой идеал!

И, венчая правду сказки,
Облик женщины возник, –
Не она ль в священной пляске,
Шла вдоль длинных коридоров, –
И летели стрелы взоров,
Чтоб в ее вонзиться лик?..

Минул ряд тысячелетий,
Лабиринт – лишь скудный прах…

*Валерий Брюсов*



*Серыя "У дапамогу педагогу"*
*заснавана ў 1995 годзе па ініцыятыве У.П.Пархоменкі*

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс
Выдаецца з I квартала 1997 года
Рэгістрацыйны № 842

# ГІСТОРЫЯ

## праблемы выкладання

№ 1 (21) ' 2002

**Заснавальнік і выдавец –
Выдавецтва
"Адукацыя і выхаванне"**

220004, г. Мінск,
вул. Караля, 16;
тэл.: (017) 229-19-71,
факс: (017) 220-54-10

**Рэдакцыйная калегія**

*Галоўны рэдактар*
**М.І.Мініцкі**

*Намеснік галоўнага рэдактара*
**Н.М.Ганушчанка**

*Адказны сакратар*
**Ж.В.Лабар**

*Члены рэдкалегіі*
І.І.Багдановіч
С.К.Ганцова
Г.А.Космач
У.С.Кошалеў
У.М.Міхнюк
С.В.Паноў
М.С.Сташкевіч
К.І.Сякацкая
У.В.Тугай
В.М.Фамін
В.М.Шутава
А.А.Яноўскі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

цесна выкарыстоўваць супрацоўніцтва з выкладчыкамі ВНУ – крыніцамі новай інфармацыі. Аднак альтруізм, як стымул для такога супрацоўніцтва, не вельмі надзейны. Застаецца разлічваць, што змены да лепшага эканамічнага становішча рэспублікі здымуць многія праблемы адукацыі.

Асноўную частку нашых вучняў складаюць звычайныя дзеці. Як быць з імі? Вострую занепакоенасць выклікае дэматывацыя вучэбнай дзейнасці. Усё часцей ад дзяцей чуем: “Не хачу вучыцца!”.

Мы ўзялі на ўзбраенне інавацыйныя педтэхналогіі, стараемся зрабіць урокі цікавымі і запамінальнымі, але чамусьці не атрымліваем жаданых вынікаў. Чаму? Што робім не так?

Тое ж адбываецца і ў выхаваўчай сферы. Маецца шмат устаноў, якія арганізуюць вольны час вучняў, у рабоце з імі выкарыстоўваюцца апошнія дасягненні педагогікі. Аднак колькасць маргінальных падлеткаў расце з году ў год. Чаму?

Думаецца таму, што сям’я ў значнай ступені перастала быць апорай не толькі для школы, але і для сваіх дзяцей, у першую чаргу. І тут варта зноў звярнуцца да паняцця “гуманізацыя адукацыйнага працэсу”. Мы дайшлі да яго розумам, але ці зразумелі сэрцам? У аснове гуманізацыі ляжыць педагагічная любоў – здольнасць настаўніка прымаць вучня такім, які ён ёсць на самой справе, здольнасць разумець яго і дапамагаць у складаных момантах жыцця. Вучань павінен стаць гаспадаром у школе: мы для яго, а не ён – для нас. І формула нашых з ім адносін будзе выглядаць так: *права вучня быць самім сабой + наша стараннасць і добрасумленнасць + інавацыйныя педтэхналогіі =* ***Асоба***. Вось тады, калі кожны з нашых вучняў будзе Асобай, мы зможам гаварыць аб вяртанні духоўнасці ў наша грамадства.



# КАЛОНКА РЭДАКТАРА

*Мікалай Мініцкі,* *кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры агульнай гісторыі БДПУ імя М.Танка, галоўны рэдактар часопіса*

9(С>)+БДПУ

## Часопіс і гістарычная адукацыя
## (асэнсаванне прыярытэтаў развіцця)

На II з’ездзе настаўнікаў вызначаны стан і акрэслены задачы нацыянальнай сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Праблемы гістарычнай адукацыі адпавядаюць як агульным праблемам, так і маюць сваю спецыфіку.

У рэзалюцыі з’езда адзначана актуальнасць розных аспектаў адукацыі, сярод якіх бліжэйшыя да дзейнасці нашага часопіса: павысіць якасць школьных падручнікаў, забяспечыць да 2007 года базавую (асноўную) школу вучэбна-метадычнымі комплексамі, сучаснымі педагагічнымі тэхналогіямі па ўсіх прадметах.

Мінулы год, у якім адбыўся II з’езд настаўнікаў Рэспублікі Беларусь, знамянальны і для жыцця нашага часопіса «Гісторыя: праблемы выкладання». Яму споўнілася пяць гадоў, выпушчана дваццаць нумароў. Таму мэтазгодна звярнуць увагу на вынікі і акрэсліць прыярытэтныя накірункі будучага развіцця. Галоўная задача выдання: адпавядаць мэтам выкладання гісторыі на



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аснове прынцыпаў дыдактыкі. Безумоўна, акрамя дыдактычных прынцыпаў на часопіс аказваў вызначальны ўплыў запыт грамадства да гістарычнай адукацыі. Часопіс у сваёй дзейнасці прытрымліваўся двух галоўных накірункаў: аднаўлення зместу выкладання і распрацоўкі яго адукацыйных тэхналогій.

У мэтах павышэння тэарэтыка-метадалагічнай адукаванасці настаўнікаў мы публікавалі (і маем намер прадаўжаць гэтую працу) найноўшыя даследаванні нашых беларускіх вучоных у галіне сусветнай і нацыянальнай гісторыі. Гэта артыкулы Я.Бабосава, Э.Іофе, У.Кошалева, У.Сідарцова, М.Сташкевіча, В.Фаміна, В.Фядосіка і інш. Мы не можам не звяртаць увагі на тэарэтыка-метадалагічныя канцэпцыі і публікаваць толькі метадычныя матэрыялы, як прапаноўваюць асобныя чытачы. Гэта супярэчыла б не толькі пазіцыям часопіса, але і сучаснаму разуменню прынцыпаў выкладання гуманітарных навук. Дарэчы прывесці словы Л.Выгоцкага: «Обучение при помощи научных концепций играет решающую роль в умственном развитии ребенка. Научные концепции реструктурируют эмпирическое знание и поднимают его на более высокий уровень». Сёння сярод педагогаў усе больш дамінуе думка, што вучыць трэба не толькі ведам, уменням і навыкам. Вучань павінен сам прымаць удзел у канструяванні ведаў, а не проста запамінаць тое, што яму прапаноўвае настаўнік. Вучыць трэба адукацыйным тэхналогіям, якія трэба разумець інакш, чым проста спосабы, сродкі і метады навучання.

Маючы на ўвазе спецыфіку часопіса, удзялялася ўвага распрацоўцы пытанняў практыка-арыентаванай тэорыі гістарычнай адукацыі: адбору яе зместу, канструяванню прадметнай мадэлі навучальнай дысцыпліны і асобных паняццяў, структураванню навучальнага тэксту. Прадаўжаючы гэтую тэматыку, а таксама кіруючыся вызначэннем надзвычайнай актуальнасці праблемы падручніка II з'ездам настаўнікаў, мы маем намер адкрыць рубрыку «Тэорыя і практыка падручніка».

Найбольшая ўвага надаецца публікацыям, звязаным з выпрацоўкай... шэннем дыдактычных задач і дакладна з методыкай выкладання. Нас вельмі задавальняе той факт, што паступова склаўся



калектыў пастаянных аўтараў. Распрацоўкі В.Ракуця, А.Карзюка, Н.Шаровай, Р.Счаснага, Л. Дзікцярова ўяўляюць сабой абагульненне перадавога настаўніцкага вопыту і з'яўляюцца здабыткам метадычнай навукі ў нашай рэспубліцы.

Мы звяртаем увагу на асаблівую важнасць публікацый для кваліфікацыйнага экзамену для настаўнікаў на вышэйшую катэгорыю. Калі публікацыі ў нашым часопісе ўлічваюцца ВАК пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, то мэтазгодна ўлічваць іх і пры атэстацыі педагагічных работнікаў сістэмы сярэдняй адукацыі.

Метадычныя матэрыялы нашага часопіса кампенсуюць недахоп вучэбна-метадычнай літаратуры. Тут патрэбны парады саміх настаўнікаў: што ім неабходна ў першую чаргу. Мы імкнёмся асвятляць развіццё тэорыі і практыкі стварэння вучэбнай літаратуры. На старонках часопіса, напрыклад, удзялялася ўвага мерапрыемствам, якія праводзіў НМЦ вучэбнай кнігі па праблемах навучальнай кнігі.

У сучасны момант у рэспубліцы ідзе напружаная, цяжкая праца па стварэнні нацыянальных падручнікаў. Ёсць пэўныя станоўчыя вынікі: адбылося аднаўленне зместу гістарычнай адукацыі. Галоўныя метадалагічны і метадычны аспекты змены адлюстраваліся ў адыходзе ад абсалютызацыі аднаго якога-небудзь прынцыпу, ці асобнай методыкі навучання. А само навучанне пачало набываць дзейснасць па асэнсаванні атрыманых ведаў і прымяненні іх у сучаснай сацыяльнай практыцы. Часопіс змяшчаў фрагменты падручнікаў з рознымі тэарэтыка-метадалагічнымі і метадычнымі падыходамі. Зварот да інтэграцыйнай мадэлі прадметнага зместу навучальнай дысцыпліны патрабуе выкарыстання ведаў розных навук: філасофіі адукацыі, кагнітыўнай псіхалогіі, лінгвістыкі. Спатрэбіцца таксама выкарыстанне метадаў семантыкі, семіётыкі, герменеўтыкі, аб чым ужо сёння сведчаць даследаванні навукоўцаў.

Разам са стварэннем асноўных базавых падручнікаў для агульнаадукацыйнай школы пачалася падрыхтоўка падручнікаў для спецыялізаваных навучальных устаноў, што адпавядае рэалізацыі прынцыпу дыферэнцыйнага падыходу ў навучанні. Тут



2 Зак. 536

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

асаблівую важнасць набывае інтэграцыйны падыход і міждысцыплінарныя сувязі паміж прадметамі гуманітарнага цыкла. Адсюль увага часопіса да праблем мастацтва, літаратуры , мовы.

Вельмі важны аспект вучэбнага працэсу – яго матэрыяльная база. Адно з першасных у гэтай справе месцаў займае стварэнне вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК). Іх прымяненне дазваляе зрабіць працэсс навучання больш тэхналагічным у розных сэнсах. Прагназаванасць, верыфікацыя, дыягностыка – усе гэтыя якасці ўласцівы для новых адукацыйных тэхналогій. Часопіс мае намер асвятляць дзейнасць, якая праводзіцца ў гэтым накірунку такімі даследчымі ўстановамі, як НІА, НМЦ, РІВШ. Дарэчы, выпушчаныя тут у апошні час працы (Учебно-методические комплексы (из опыта разработки), авторы-составители: *Жук А.И., Макаров А.В.* – Мн., 2001; *О.Е.Лисейчиков*. Педагогическое проектирование содержания учебных курсов и базисного плана 12-летней школы в условиях разноуровневого обучения. – Мн., 2001) ствараюць высновы для рэалізацыі гісторыкамі найноўшых педагагічных канцэпцый канструявання вучэбнай літаратуры. У дадатак стварыліся спрыяльныя ўмовы і з боку метадалагічнага забеспячэння (маецца на ўвазе выхад манаграфіі *У.Н.Сідарцова* «Методология исторического исследования». – Мн., 2000). Перад гісторыкамі ўзніклі новыя магчымасці вырашэння задачы аб'яднання тэорыі педагогікі і метадалогіі з практыкай выкладання, перакладам навуковых ведаў у навучальныя. Як неабходны мінімум патрэбна яшчэ дапамога псіхолагаў і лінгвістаў, бо трэба ўлічваць тыпы мыслення і логіку пабудовы тэксту.

Непасрэдным сведчаннем гэтага з'яўляецца нявырашанасць праблемы складанасці нашых падручнікаў. Не было ніводнага прадстаўнічага навуковага форуму альбо адміністрацыйнага пасяджэння, прысвечаных адукацыйнай тэматыцы, каб не гучала гэтая тэма. Аб'ектыўны рост навуковай інфармацыі, неаргументаваныя хістанні ў ацэнцы гістарычных фактаў, параўнальнае адставанне методыкі навучання (асабліва слабае выкарыстанне спосабаў мыслядзеяння), ігнараванне ведаў (а часам і іх адсутнасць) аб



псіхафізіялагічным стане сучаснай моладзі – вось што, на наш погляд, утварае бар'ер непаразумення паміж вучнем і падручнікам.

Парадокс сітуацыі склаўся ў тым, што асобныя з гэтых задач магчыма вырашыць ужо цяпер. Напрыклад, аб'ём падручнікаў. Што тычыцца тэхналогій канструявання тэксту, ці, як казалі раней, логікі яго пабудовы, то яе распрацоўку вялі з 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Пазней з'явіліся працы А.Сахора (1974), Я.Міка (1981), Д.Блюменаў (1982), Т.Дрыдзе (1984), Л.Даблаева (1987) і іншых навукоўцаў. І што больш дзіўна: цяпер маюцца самыя сучасныя камп'ютэрныя тэхналогіі апрацоўкі тэксту на аснове псіхалінгвістыкі. Дарэчы, іх кошт на расійскім рынку даволі высокі. Мы маглі б распрацаваць і свае тэхналогіі, але справа ў арганізацыі, часе і зноў-такі ў сродках. На наш погляд, неабходна стварыць лабараторыю тэхналогій падручніка за кошт перабудовы блізкіх да гэтай справы некаторых структур у НІА ці НМЦ. Трэба выкарыстаць і тэхналогіі, напрацаваныя нашымі навукоўцамі. Тое, што ўжо вядома, дазваляе скараціць аб'ём тэксту падручнікаў ад адной чвэрці да трэці, не паніжаючы, а, наадварот, павышаючы яго якасць.

Падсумоўваючы агляд праблем падручніка, трэба звярнуцца яшчэ да адной – выхаваўчай мэты зместу гістарычнай адукацыі. Набыццё ведаў, развіццё мыслення і інтэлекту – справа вельмі патрэбная. Але ні ў якім разе нельга пакідаць без увагі выхаваўчыя мэты і каштоўнасны падыход да выкладання гісторыі. Рэдакцыя звяртае ўвагу на недастатковасць артыкулаў па гэтай тэматыцы і будзе публікаваць іх у першую чаргу.

Зараз у НІА распрацоўваюцца стандарты і канцэпцыя гістарычнай адукацыі. Стандарты павінны забяспечыць склад, структуру і функцыі зместу адукацыі, вызначыць узроўні абавязковага і магчымага засваення, служыць сродкам дыягностыкі і гарантаванага ўзроўню ведаў. Выкананне такіх патрабаванняў да стандартаў будзе садзейнічаць таксама дыферэнцыраванаму падыходу да навучання і выхавання.

У канцэпцыі вызначаны: 1) агульныя палажэнні (тэарэтычныя, метадалагічныя і канцэптуальныя праблемы школьнай гістарычнай



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

адукацыі); 2) мэты і задачы гістарычнай адукацыі; 3) тэарэтычныя падыходы і асаблівасці канструявання зместу гістарычнай адукацыі; 4) сутнасная характарыстыка гістарычнай адукацыі па ступенях (базавая, сярэдняя) і ўзроўнях (профільны, паглыблены); 5) вучэбна-метадычнае забеспячэнне гістарычнай адукацыі.

Рэдакцыя часопіса будзе імкнуцца прапагандаваць распрацаваныя матэрыялы па стандартах і канцэпцыі гістарычнай адукацыі.

Часопіс асвятляў старонкі навуковага жыцця, звязаныя з шырокім спектрам адукацыйных праблем. Сярод такой інфармацыі найбольш значныя звесткі аб канферэнцыі па метадалогіі гісторыі (1997), гістарычнай інфарматыцы (1997), гендарнай гісторыі (1999), міжнародным кангрэсе «Наука и образование на пороге III тысячелетия» (2000).

Мы наважаны ўдзяляць увагу агляду новых кніг як па гісторыі, так і па іншых галінах навукі, якія непасрэдна, альбо ўскосна могуць аказаць уплыў на развіцце гістарычнай адукацыі.

Некалькі слоў аб афармленні часопіса. Выкарыстанне спецыяльных сімвалаў і малюнкаў мае заўсёды прамы ці ўскосны гістарычны сэнс. Зварот да трапных выказванняў адлюстроўвае векавую мудрасць і ментальнасць народа. Канцэпцыя падачы ілюстрацыйнага матэрыялу будзе перагледжана. У якасці мастацкіх заставак будзе выкарыстоўвацца матэрыял, скамбінаваны па тэматычных ці храналагічных прынцыпах.

Нашы галоўныя накірункі ў нумарах гэтага года застаюцца без змяненняў. Асаблівую ўвагу нашых аўтараў хацелася б звярнуць на наступныя пытанні ў змесце гістарычнай адукацыі: **дыялог культур, духоўныя каштоўнасці, патрыятызм, менталітэт, гісторыя паўсядзённасці; аднаўленне метадалагічнага і метадычнага забеспячэння: навуковыя прынцыпы, крытэрыі адбору і канструяванне зместу вучэбных курсаў гістарычнай адукацыі, праблемы цяжкасці ўспрыняцця вучэбнага тэксту, новыя адукацыйныя тэхналогіі.**

*Чакаем водгукаў і пажаданняў на будучыню, спадзяёмся на ўзаемнае супрацоўніцтва і павагу.*





# ТЭОРЫЯ І МЕТАДАЛОГІЯ

*Вячеслав Меньковский, кандидат исторических наук, докторант кафедры истории России БГУ*

# Англо-американская историография социальной истории Советского Союза 1930-х гг.

Второй раунд дискуссии о социальной истории сталинского периода развернулся на страницах «Российского обозрения» в октябре 1997 г. – ровно через год после появления первых публикаций. Во вступительной статье «Больше полемики» редактор журнала А.Вилдман отметил большой интерес, который вызвала дискуссия в среде советологов, сообщил о большом количестве материалов, присланных для публикации, в том числе теми авторами, чьи работы анализировались в ходе полемики. «Социальные историки, – писал он, – защищают свои работы по-разному, но все они настаивают на том, что просто применяют к изучению сталинского периода ту технику и подходы, которые другие историки применяют по отноше-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ